# СЕКЦИЯ СЛАВЯНСКОЙ ФИЛОЛОГИИ

***М. В. Акіншава** (УА «ГДУ імя Ф. Скарыны»)*
*Навук. кір.* ***А. М. Мельнікава,***
*к.ф.н, дацэнт*

## РЫСЫ ПОСТМАДЭРНІЗМУ Ў ТВОРЧАСЦІ УЛАДЗІМІРА АРЛОВА

Постмадэрнізм – вельмі шырокае паняцце, якое ўвабрала ў сябе шмат з'яў і ахапіла многія сферы чалавечага жыцця. Існуе меркаванне, што постмадэрнізм – гэта своеасаблівы тып светабачання, які адлюстроўваецца ў творчасці. У вузкім сэнсе постмадэрнізм – гэта літаратурны напрамак, які вылучаецца такімі адзнакамі, як інтэртэкстуальнасць, парадзіраванне, іронія, пераасэнсаванне элементаў культуры мінулага, жанравы і стылявы сінкрэтызм і інш. Постмадэрнізм развіваецца і ў беларускай літаратуры, набывае тут своеасаблівыя нацыянальныя рысы, у прыватнасці, спалучаецца з авангардам. У сувязі з гэтым нельга не прыгадаць беларускую постмадэрную суполку "Бум-Бам-Літ", сябры якой актыўна прапагандавалі згаданы напрамак.

Акрамя таго, рысы постмадэрнізму часткова праяўляюцца і ў творчасці пісьменнікаў-непостмадэрністаў. Сярод іх і Ул. Арлоў. У яго творах значную ролю адыгрывае іронія, якая ў спалучэнні з гумарам стварае непаўторны аўтарскі стыль.

Пры дапамозе іроніі Ул. Арлоў пераасэнсоўвае рэаліі папярэдняга савецкага перыяду жыцця, закранае пытанні амаральных паводзін людзей, праблему пратэктарства нядольных працаўнікоў.

Часта звяртаецца пісьменнік і да самаіроніі.

Таксама Ул. Арлоў актыўна выкарыстоўвае ў сваіх творах цытаты і рэмінісцэнцыі, рэалізуючы тым самым прынцып інтэрэкстуальнасці і пацвярджаючы тэзіс постмадэрнізму аб тым, што ўвесь свет ёсць тэкст. Цытаты ў пісьменніка сустракаюцца розных тыпаў: і дакладныя, даслоўныя, з указаннем аўтара, і прыхаваныя, якія разлічаны на пазнаванне чытачом, і рэмінісцэнцыі, прыпамінанні, і простая ўзгадка імя знакамітага чалавека.

Постмадэрнісцкая гульня таксама знайшла свой адбітак у творчасці Ул. Арлова. Пісьменнік "гуляе" з сэнсамі, з мовай, з сюжэтам. Усё гэта дазваляе ў поўнай меры выказаць свае творчыя задумы, неардынарна перадаць патрэбную думку. Акрамя таго, гульнёвая шматварыянтнасць у творах пісьменніка пацвярджае палажэнне постмадэрнізму аб рызаматычнасці ісціны. Аднак у пісьменніка адсутнічаюць такія рысы постмадэрнізму, як гульня на публіку, тэатральнасць, прынцып "смерці аўтара". Гэта тлумачыцца тым, што Ул. Арлоў не з'яўляецца постмадэрністам і не ставіць на мэце рэалізаваць прыёмы гэтага накірунку ў сваёй творчасці.

***И. В. Алейникова** (УО «ГГУ им. Ф. Скорины»)*
*Науч. рук.* ***А. Ф. Рогалев,***
*д.ф.н., профессор*

## АНТРОПОНИМЫ С ФОРМАНТОМ *-ОВ, -ЕВ*

На русской этноязыковой территории господствующим типом фамилий являются патронимические фамилии с формантом *-ов, -ев*. В Беларуси данные антропонимы составляют 20 % всего фамильного фонда. Данные антропонимы в своих истоках были притяжательными прилагательными и выполняли функцию отчеств [2, с. 62]. Среди антропонимов на *-ов, -ев* выделяются следующие тематические группы:

1 антропонимы, образованные на основе прозвищ. Прозвища принадлежали к разговорной стихии, практически при этом не употребляясь в литературном языке, и